Управление по образованию
Минского районного исполнительного комитета

**Государственное учреждение образования**
**«Сёмковская средняя школа»**

Конкурс краеведческих работ
«Уроженцы Пристоличья… Помним. Чтим. Гордимся»,
посвященный 75-летию Победы Советского народа
в Великой Отечественной войне

**Номинация «И будет вечной память»**

# ***“Іван Іванавіч Матусевіч –***
# ***знакаміты ўраджэнец Сёмкаўскага края”***

Автор:
Холевинская Варвара,
учащаяся 7 “Б” класса
Руководители: Хоменкова Т.В.,
Некрашевич А.В.



Сёмково, 2020

# Уводзіны

Для маіх аднакласнікаў тэма Вялікай Айчыннай вайны – адна з самых любімых на ўроках гісторыі Беларусі. Акрамя таго, што адбывалася на тэрыторыі нашай Радзімы, мы ведаем пра лёс у гэты няпросты час і нашай малой Радзімы, на той час яшчэ вёскі, Сёмкава.

Пра гераічны подзвіг партызанскай брыгады “Штурмавая” па ратаванні 274 выхаванцаў сёмкаўскага дзіцячага дома ў нашай школе ведае бадай што кожны вучань. Штогод, напрыканцы зімы, мы ўдзельнічаем ва ўрачыстым мітынгу памяці гэтай падзеі. Перад мітынгам часта ў нашай школе адбываюцца сустрэчы з пісьменнікам Мікалаем Чаргінцом, аўтарам рамана “Аперацыя кроў”. Гэты раман заснаваны на дакументальных сведчаннях падзей, якія адбываліся ў тым ліку ў Сёмкава. На мітынгу раней прысутнічалі, пакуль былі жывыя, былыя выхаванцы сёмкаўскага дзіцячага дома, жонкі партызанаў брыгады “Штурмавая”. Восенню гэтага навучальнага года наша школа прымала ўнука аднаго з партызан гэтай гераічнай брыгады.

З мінулага года ў нашай школе з’явіўся школьны краязнаўчы куток і распачаліся рэгулярныя заняткі краязнаўствам. Нашы веды па гісторыі Сёмкаўскага края пашыраюцца і паглыбляюцца. З нагоды 75 годдзя Вялікай Перамогі мы больш увагі надаем вывучэнню гісторыі Вялікай А чыннай вайны ў Сёмкава і ваколіцах. Увосень навучэнцы нашай школы наведалі брацкую магілу вёскі Сёмкаў Гарадок і даведаліся пра гісторыю гэтай вёскі. Адбыўся паход і ў в. Сялюты, адкуль падчас вайны частку жыхароў вывезлі для знічтажэння ў лагер смерці Трасцянец…

Вялікім адкрыццём для нас было, што адзін з арганізатараў знакамітага мінскага падполля, Іван Іванавіч Матусевіч, наш зямляк! З суседняй з Сёмкава вёскі Лапаравічы, адкуль родам некаторыя вучні нашай школы. А мы пра Лапаравічы раней чулі і чыталі толькі інфармацыю пра былую дачу песняра Уладзіміра Мулявіна, дом біятланісткі Дар’і Домрачавай, зямлю актора Жэрара Дэпардзьё…

Вынікам адкрыцця і вувучэння матэрыялаў, падарожжа на малую Радзіму героя-падпольшчыка стала напісанне гэтай даследчай працы...



# Вялікая Айчынная вайна ў Беларусі

У гады Вялікай Айчыннай вайны Беларусь страціла кожнага трэцяга жыхара, але нават залітая крывёй мільёнаў людзей, разрабаваная і напаўразбураная, краіна не здавалася. Праз многія дзесяцігоддзі памяць пра подзвіг народа, які ўнёс вялікі ўклад у Перамогу над фашызмам – свяшчэнная.

Сярод 34,4 мільёна савецкіх воінаў, якія ўдзельнічалі ў баявых дзеяннях на франтах Вялікай Айчыннай вайны, больш за 1,3 мільёна – беларусы і ўраджэнцы Беларусі.

На беларускай зямлі Вялікая Айчынная вайна (22 чэрвеня 1941 г. – 9 мая 1945 г.) доўжылася 3 гады 1 месяц і 6 дзён – з 22 чэрвеня 1941-га па 28 ліпеня 1944 года.

Тут праходзілі маштабныя баі і ваенныя аперацыі, сярод якіх: гераічная абарона Брэсцкай крэпасці ў першыя дні вайны; абарона Магілёва, які не здаваўся 23 дні і ночы; "Баграціён" – адна з найвялікшых наступальных аперацый у гісторыі чалавецтва…

Акупіраваная фашыстамі Беларусь стала краінай, дзе разгарнуўся буйнейшы ў Еўропе партызанскі і падпольны рух. Супраць захопнікаў змагаліся больш за 374 тысячы партызан, больш як 70 тысяч удзельнікаў налічвала антыфашысцкае падполле.

Першы партызанскі бой Другой сусветнай вайны правёў 28 чэрвеня 1941 года ў наваколлі Пінска атрад легендарнага камандзіра Васіля Каржа.

Першымі партызанамі-героямі СССР у 1941 годзе сталі беларусы Ціхан Бумажкоў і Фёдар Паўлоўскі.

У ліпені 1943 года на чыгуначнай станцыі ў Асіповічах партызаны ажыццявілі буйнейшую дыверсію, узарваўшы 4 нямецкія эшалоны з боепрыпасамі і танкамі "Тыгр".

А адным з самых вялікіх партызанскіх баёў у гісторыі вайны стала Полацка-Лепельская бітва 1944 года. Да канца 1943 года пад кантролем партызан знаходзілася 108 тысяч км² – амаль 60% акупіраванай праціўнікам тэрыторыі. Сярод самых вялікіх партызанскіх зон былі Клічаўская, Полацка-Лепельская, Суражскія (Віцебскія) "вароты"…

У час Вялікай Айчыннай вайны менавіта ў беларускім Мінску дзейнічала самае вялікае гарадское антыфашысцкае падполле ў Еўропе.

Адной з самых памятных старонак гісторыі мінскага супраціўлення стала аперацыя па ліквідацыі стаўленіка Гітлера ў Беларусі – гаўляйтара Вільгельма Кубэ. У ноч на 22 верасня 1943 года ў пасцелі ката, які знішчыў



сотні тысяч жыццяў, узарвалася смяротная міна. Праз гады гэта гісторыя была пакладзена ў аснову сюжэту вядомага савецкага фільма "Гадзіннік спыніўся апоўначы" – першай кінастужкі аб героях мінскага падполля…

Аднак нягледзячы на гераічнае супраціўленне народа, Беларусь, якая стаяла на шляху нацысцкай арміі Германіі, несла ў гады вайны незаменныя страты…

На беларускай зямлі былі разрабаваны і разбураны 209 з 270 гарадоў. Фашысты правялі ў Беларусі больш за 140 карных аперацый, поўнасцю або часткова знішчыўшы 5454 вёскі. Сумна вядомым сімвалам бязлітаснай расправы стала спаленая разам з людзьмі Хатынь, лёс якой падзялілі яшчэ сотні вёсак краіны…

На тэрыторыі Беларусі фашысты стварылі больш як 260 лагераў смерці і месц масавага знішчэння людзей. У гэтым трагічным спісе: чацвёрты па велічыні ў Еўропе лагер смерці "Трасцянец", дзе знішчылі больш за 200 тысяч чалавек (ёсць сведчанні, што ахвяр было намнога больш – амаль 546 тысяч); жудасны дзіцячы канцлагер у вёсцы Чырвоны Бераг, дзе самымі бесчалавечнымі спосабамі з юных ахвяр – да смерці – забіралі кроў для патрэб нямецкіх шпіталяў; Азарыцкая зона смерці, дзе пад адкрытым небам нацысты трымалі тысячы хворых на сыпны тыф, збіраючыся выкарыстоўваць людзей у якасці бактэрыялагічнай зброі супраць наступаючай Чырвонай Арміі…

Паводле няпоўных даных, у лагерах на тэрыторыі Беларусі нацысты знішчылі амаль 1,5 мільёна чалавек – не толькі мясцовых жыхароў, але і вывезеных з Аўстрыі, Польшчы, Чэхаславакіі, Францыі, Германіі…[1]



## Вялікая Айчынная вайна на тэрыторыі

## Папернянскага сельскага савета

Падчас Вялікай Айчыннай вайны на загінулі падчас абароны Айчыны і пахаваныя на тэрыторыі раёна 785 чалавек[2]

На тэрыторыі Папернянскага сельскага савета загінулі 230 мірных жыхароў, 51 партызан, 31 на катаржных работах у Германіі, не вярнуліся з фронту 297 чалавек. [3]

На землях нашага сельскага савета знаходзіцца 7 брацкіх магіл, 2 магілы ахвяр фашызму і магіла Хачэўскай С.В.

Найбліжэйшая да нашай школы брацкая магіла савецкіх воінаў ў в. Сёмкаў Гарадок. Магіла размешчана ў цэнтры вёскі, злева ад вясковых могілак і царквы ў гонар Раства Божай Маці (вул. Школьная, 7). Пахаваны 25 воінаў, якая загінулі ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў цэрвені 1941 г. і ў ліпені 1944 г. 1950 г. на магіле ўстаноўлены абеліск, у 1975 г. – новы помнік. [4]



***Вучні Сёмкаўскай СШ каля Брацкай магілы савецкіх воінаў ў в. Сёмкаў Гарадок.***

[2] Минский районный исполнительный камитет. Список погибших при защите Отечества, захороненных на территории Минского района http://mrik.gov.by/be/kultura/poiskovaya-deyatelnost/voiny-krasnoj-armii-i-partizany-pogibshie-v-gody-vov-pri-zashchite-i-osvobozhdenii-minskogo-rajona-i-pokhoronennye-na-ego-territorii

[3] Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Мінскага р-на. — Менск: БелЭн, 1998. — 640 с.

[4] Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Мінскага р-на. — Менск: БелЭн, 1998. — 640 с.

## Загінуўшыя падпольшчыкі, партызаны, мірныя жыхары[5]

### Вёска Аронава Слабада.

КАЎРЫГОВІЧ Віктар Іванавіч, нар. ў Мінску, загінуў 18.04.1944, пахаваны ў в. Аронава Слабада.

РАБУШКА Сафія Пятроўна. Нрадзілася ў 1923, у 1942 расстраляна фашыстамі за сувязь з партызанамі.

### Вёска Лапаравічы.

МАТУСЕВІЧ Іван Іванавіч, нарадзіўся ў 1884, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў Мінскага патрыятычнага падполля, загінуў ў лютым 1943 у фашысцкіх засценках. Пахаваны ў Мінску, дзе яго імем названа вуліца.




### Вёска Сёмкаў Гарадок.

КАМІНСКІ Аляксандр Аляксандравіч, нарадзіўся ў 1919, падпольшчык, загінуў пры выкананні баявога задання каля в. Сёмкаў Гарадок 03.06.1944

### Вёска Сёмкава.

ДЗЯТКО Міхаіл Іосіфавіч, загінуў 15.02.1944 каля роднай вёскі.

ДЗЯТКО Міхаіла Міхайлавіч, нар. ў 1915, партызан, загінуў 28.02.1944, пахаваны ў роднай вёсцы.

### Вёска Сялюты

ГАРОШКА Іосіф, нарадзіўся ў 1899, спалены ў лагеры смерці Трасцянец у 1944 г.

ПОМНИМ! ГОРДИМСЯ!

ДАМБРОЎСКІ Мікалай Максімавіч, нар. ў 1898, спалены ў лагеры смерці Трасцянец у 1944 г.

ЗАЛЕЎСКАЯ Наталля Іванаўна, нар. ў 1898, спалена ў лагеры смерці Трасцянец у 1944 г.

ЛІСІЦКІ Сцяпан Сцяпанавіч, нар. У 1901, спалены ў лагеры смерці Трасцянец у 1944 г.

ФІЛІПОВІЧ Максім Іванавіч, нар. У 1900, спалены ў лагеры смерці Трасцянец у 1944 г.



***Вёска Сялюты. У гасцях у В.Я. Гарошка – далёкай сваячніцы Іосіфа Гарошка***

## Мінскае падполле і яго арганізатары

На захопленай ворагам тэрыторыі стваралася сетка падпольных цэнтраў, арганізацый і груп. Яркая старонка гэтай барацьбы - Мінскае падполле, арганізатарамі якога былі **І. Казінец**, **І. Кавалёў**, **У. Амельянюк**, **І. Матусевіч** і інш. З першых дзён акупацыі горада падпольшчыкі ўчынялі дыверсіі на прадпрыемствах, у фашысцкіх установах, перадавалі ў партызанскія атрады зброю, медыкаменты, звесткі аб руху ваенных эшалонаў, планы размяшчэння ваенных аб'ектаў.[6]

Пасля перамогі ў Маскоўскай бітве падпольная барацьба ў гарадах і населеных пунктах Беларусі шырылася і паглыблялася. Відавочную ролю ў

гэтым адыграў той фактар, што была праведзена работа па ўстанаўленню сувязі кіраўніцтва падполля з Вялікай зямлёй, адкуль праз аэрадромы партызанскіх фарміраванняў падпольшчыкам паступалі не толькі неабходныя звесткі, але і значная дапамога зброяй, мінна-ўзрыўной тэхнікай, медыкаментамі. Умацавалася сувязь падполля з насельніцтвам, партызанскімі атрадамі і групамі. Усё гэта разам самым станоўчым чынам адбілася на дзейнасці падполля.

Мінскія падпольшчыкі ў 1942 г. сваю ўвагу засяродзілі на масава-агітацыйнай рабоце сярод жыхароў горада, сістэматычных дыверсіях на розных аб’ектах, зборы для партызан разведвальных звестак, вызваленні ваеннапалонных і патаемнай адпраўцы іх у лес да партызан. Не абышлося і без цяжкіх страт. У сакавіку-красавіку 1942 г. за турэмныя краты трапіла больш за 400 чалавек, у тым ліку члены падпольнага ГК КП(б)Б С.І.Заяц (Зайцаў), І.П.Казінец, Г.М.Сямёнаў. 7 мая яны былі павешаны, а яшчэ 251 чалавек былі расстраляныя. Мінскае падполле знайшло ў сябе сілы зноў узняцца на барацьбу. На нарадзе ў маі 1942 г. былі прааналізаваны прычыны правалу, і былі створаны аддзелы: разведкі, агітацыі і прапаганды, ваенны, арганізацыі дыверсій, сфарміраваны пяць падпольных райкомаў партыі, шэраг падпольных партыйных і камсамольскіх арганізацый на прадпрыемствах і ва ўстановах. Падпольшчыкі выпускалі газету «Звязда», лістоўкі, мелі сувязь з падполлем Асіповічаў, Оршы, Бабруйска, Дзяржынска, Узды, Калодзішчаў, Смалявічаў, іншых гарадоў і населеных месцаў Беларусі.

У ноч на 26 верасня 1942 г. зноў пачаліся арышты ўдзельнікаў падполля. Сярод іх – сакратар падпольнага гаркома І.К.Кавалёў, члены камітэта Дз.А.Караткевіч, В.К.Нікіфараў, К.І.Хмялеўскі, сакратары райкомаў Н.Я.Герасіменка (з сям’ёй), М.К.Каржанеўскі, **І.І.Матусевіч**, М.А.Шугаеў, кіраўнікі падпольных арганізацый і груп, актыўныя падпольшчыкі Л.Я.Адзінцоў, М.А.Багданаў, Е.М.Баранаў і іншыя.Удар, нанесены акупантамі мінскаму падполлю восенню 1942 г., быў вельмі цяжкім, але і ён не прымусіў патрыётаў скарыцца. Сведчаннем таму былі расклееныя 21 кастрычніка 1942 г. больш чым у 300 месцах горада лістоўкі з заклікам яшчэ мацней біць акупантаў.

З мэтай дыскрэдытаваць падполле была распрацавана версія аб здрадзе кіраўніцтвам ГК КП(б)Б, у першую чаргу яго сакратаром І.К.Кавалёвым. На жаль, гэтай фальшыўцы гітлераўскіх спецслужб паверылі ў ЦК КП(б)Б, і на доўгія гады над мінскім падполлем навісла хмара недаверу. Мінскае падполле і пасля другога правалу працягвала сваю дзейнасць. Цесную сувязь з ім мелі шэраг партызанскіх брыгад. У горадзе практычна не было ніводнага прадпрыемства ці ўстановы, дзе б ні

дзейнічалі патрыёты. Дзесяткі дыверсійных груп былі створаны на Мінскім чыгуначным вузле. У другой палове 1943 г. тут было праведзена больш за 50 дыверсій. Па ўдакладненных данных, у складзе мінскага падполля самааддана змагалася звыш 9 тыс. чалавек, больш тысячы камуністаў і звыш 2 тысяч камсамольцаў, антыфашысты замежных краін. За час акупацыі ў Мінску было праведзена звыш 1500 дыверсій. Тут нашлі сваю пагібель многія высокапастаўленыя асобы, у тым ліку генеральны камісар Беларусі В.Кубэ.

Аналіз такой гістарычнай з'явы перыяду Вялікай Айчыннай вайны, як дзейнасць антыфашысцкага падполля на часова акупаванай немцамі тэрыторыі Беларусі, сведчыць, што падполле з пачатку і да канца свайго існавання (а праз яго за гады вайны прайшло звыш 70 тыс. чалавек) было цесна звязана з народнымі масамі, абапіралася на іх пастаянную падтрымку і канкрэтную дапамогу. У яго ўзнікненні і дзейнасці вялікую ролю адыгралі камуністы, што знаходзіліся ў варожым тыле і карысталіся даверам мясцовага насельніцтва. Сведчаннем гэтага з'яўляецца і той факт, што за тры гады варожай акупацыі ў партыю непасрэдна на акупаванай тэрыторыі Беларусі ўступіла звыш 12,5 тыс. патрыётаў.[7]

**Матусевіч Іван Іванавіч (1884 –1942)**



Нарадзіўся 20 студзеня 1884 года ў вёсцы Лапаравічы Мінскага раёна. Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў Мінскага камуністычнага падполля ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Член КПСС з 1917 года. Удзельнік Грамадзянскай вайны. У 1941 служачы на Мінскім чыгуначным вузле, удзельнічаў у эвакуацыі насельніцтва і абсталявання ў савецкі тыл. У пачатку акупацыі горада стварыў з Ф. С. Кузняцовым на вагонарамонтным заводзе ім. А. Ф. Мяснікова падпольную партыйную арганізацыю, якая падрывала эшалоны на чыгунцы, выводзіла з ладу паравозы і зрывала іх рамонт, вяла прапагандысцкую працу сярод насельніцтва, перапраўляла людзей у партызанскія атрады.




[7] https://www.istoriya.org/padpolnaya-baratsba/

Прымаў удзел у распрацоўцы плану буйной дыверіі на Мінскім чыгуначным вузле, якая адбывалася ў снежні 1941 г.: падпольшчыкі пашкодзілі дзве вадапомпавыя станцыі. У выніку гэтай дыверсіі на 10 дзен, якія сыйшлі на рамонт трубаў, праца чыгуначнага вузла была спыненая. Нэта адбылося акурат падчас Бітвы за Маскву. У тыя дні замест 90-100 цягнікоў на суткі з Мінска выходзіла не больш за шэсць.

З верасня 1942 году сакратар Чыгуначнага падпольнага райкама КП(б)Б Мінска. На яго кватэры падпольшчыкі рэгулярна прымалі зводкі Савінфармбюро, які потым перапівалі і распаўюджвалі сярод насельніцтва.

02.10.1942 арыштаваны Гестапа. З турмы даслаў сям'і две запіскі:

***«Пришлите мне табаку, кореньев сухих на чердаке и спичек без коробки… Я здоров. Хожу на работу возле тюрьмы. Можете меня видеть»***

***«Оля напиши мне, что у вас слышно… Я здоров… Допросы были…»***

Загінуў у фашысцкіх засценках 28 літапада 1942 года. Пахаваны ў Мінску на Кальварыйскіх могілках, на магіле ўстаноўлена стэла. У 1966 годзе пасмяротна узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені.






**Памяць пра Івана Іванавіча Матусевіча:**

У гонар І.І. Матусевіча ў 1971 названа вуліца Фрунзенскага раёна Мінска, на доме № 1 мемарыяльная дошка.








Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Сярэдняя школа №49 г. Мінска” носіць імя Івана Іванавіча Матусевіча.

У Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны экспануецца фотапартрэт І. І. Матусевіча, яго асабітыя дакументы і значок члена РКП(б).

Іван Іванавіч Матусевіч з’яўляеца адным із галоўных герояў дакументальнай аповесці Івана Новікава “Руіны страляюць ва ўпор”.









Па гэтай аповесці ў 1971 годзе быў зняты фільм “Руіны страляюць”. Ролю І. І. Матусевіча выканаў Аляксей Чарноў.

**Падарожжа ў Лапаравічы**

Пасля знаёмства з біяграфіяй Івана Івана Матуевіча ў нас узнікла жаданне зняць пра яго відэа, каб з дапамогай сучасных сродкаў данесці цікавую інфармацыю да аднашкольнікаў і аднавякоўцаў.

Мы планавалі наведаць не толькі Лапаравічы, але і прайсці дарогамі, звязанымі з Матусевічам у Мінску: наведаць яго магілу на Кальварыйскіх могілках, пабываць на вуліцы Матусевіча, пабачыць яго ўласныя рэчы ў музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, а можа нават і пазнаёміцца з навучэнцамі школы, якая носіць яго імя.

Здымка планавалася на вясновых канікулах. Але ў Беларусь прыйшоў небяспечны вірус і давялося нашыя планы значна скараціць – мы наведалі толькі Лапаравічы.

Надвор’е было ветранае і дажджлівае. Нікога з карэннага насельніцтва



сустрэць не давялося, таму ідэя паспрабаваць знайсці дом, у якім нарадзіўся наш знакаміты зямляк не ажыццявілася. Але праз бабулю аднакласніка, якая родам з Лапаравіч мы ў будучым паспрабуем ажыццявіць задуманае, а можа нават і адшукаем нашчадкаў Матусевічаў. Верым, што ў будучым зможам правесці здымкі і ў Мінску.

Пабываць на радзіме Івана Іванавіча Матусевіча было важна і цікава для нас. Якія прыгожыя пейзажы яго ў маленстве атачалі! Бераг Заслаўскага вадасховішча, Мінскага мора, з боку Лапаравіч неверагодна прыгожы…

З Лапаравіч зараз ужо добра відаць ускрайкі горада Мінска, званне “горада-героя” які атрымаў дзякуючы гераічнаму подзвігу подпольшчыкаў. А ці ведаюць жыхары вуліцы Каменнагоркай, што з вокнаў верхніх паверхаў іх дамоў бачныя Лапаравічы, дзе нарадзіўся падпольшчык Матусевіч?

**Заключэнне:**

Тэма Вялікай Айчыннай вайны працягвае быць святой для нашага народа. З пакалення ў пакаленне перадаюцца расповеды пра подзвігі дзядоў і прадзедаў. Партрэты продкаў, якія змагаліся за мірнае неба над нашымі галовамі ўпрыгожваюць сямейныя альбомы і шэсце акцыі “Беларусь памятае” на свята Вялікай Перамогі…

Краязнаўчая дзейнасць – гэта магчымасць ажывіць гісторыю Малой Радзімы, ўявіць яе ў асобах, звязаць мінулыя пакаленні з сучаным і будучым. Даледчыцкая дзейнасць у дадзеным кантэкце для нас – гэта вывучэнне біяграфіі і патрыятычнай дзейнасці Івана Іванавіча Матуевіча, пра подвіг якога мы зараз ведаем, будзем памятаць і ганарыцца.

Удзел у конкурсе натхніў нас не толькі на здымкі аднаго відэа, але іншыя відэа краязнаўчай тэматыкі. Праз стварэнне ю-туб канала “Сёмкаўкі край” мы плануем распаўсюджваць свае веды аднашкольнікам і жыхарам Сёмкава.

